# ЮРГЕН ЦАРУСКІ – АЎТАРЫТЭТНЫ ДАСЛЕДЧЫК ГЕРМАНСКАГА НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІЗМУ І БЛІСКУЧЫ ЗНАЎЦА ГІСТОРЫІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

4 сакавіка 2019 г. пайшоў з жыцця Юрген Царускі – навуковы супрацоўнік Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене (ІНГ-М), які ў апошнія два гады з’яўляўся галоўным рэдактарам ведамаснага часопіса «Штоквартальнік найноўшай гісторыі» (Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte). Гэта навуковае выданне, створанае праз чатыры гады пасля ўзнікнення інстытута ў 1949 г., дзесяцігоддзі служыць усебаковаму адлюстраванню на яго старонках падзей найноўшай гісторыі XX стагоддзя, перыяду панавання нацыянал-сацыялізму ў Германіі, а таксама яго вымярэнню ў еўрапейскім маштабе, страціла не толькі свайго галоўнага рэдактара, але і аўтарытэтнага даследчыка Трэцяга рэйха, апантанага гісторыка з сусветна вядомым імем і бліскучага знаўцу Другой сусветнай вайны, у тым ліку на акупаваных усходніх тэрыторыях.

Юрген Царускі пачаў працу ў Інстытуце ў 1990 г., калі паспяхова абараніў дысертацыю і атрымаў ступень доктара філасофіі ў Мюнхенскім універсітэце імя Людвіга і Максіміліяна[1]. Сваё навуковае даследаванне малады гісторык прысвяціў адметнаму перыяду Веймарскай рэспублікі і крытычнаму разгляду ролі нямецкай сацыял-дэмакратыі. Фокус сваіх далейшых навуковых пошукаў ён скіраваў на раскрыццё маштабаў нацысцкіх злачынстваў як на тэрыторыі акупаваных краін Усходняй Еўропы, так і ў Беларусі.

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла не толькі добра ведаць Юргена Царускі, але і сустрэць сярод нямецкіх даследчыкаў вайны блізкіх па духу аднадумцаў, каго заўсёды хацелася пабачыць, з кім карцела паразмаўляць, падзяліцца думкамі, пачуць суразмоўцу і г.д. Наша знаёмства адбылося ў Мюнхене на сёмы дзень новага 2003 года, у самым пачатку маёй месячнай навуковай стажыроўкі ў сценах добра вядомай у Германіі і за яе межамі пазаўніверсітэцкай навуковай установы – Інстытута найноўшай гісторыі. Паводле падрабязнага расповеду, пачутага ад Юргена, мне пашчасціла апынуцца ў даследчай установе, якая з сярэдзіны 1990-х гадоў пашырыла сваё прадстаўніцтва, адкрыўшы філіял у Берліне, дзе галоўную навуковую мэту бачылі ў даследаванні пытанняў палітычных і грамадскіх зменаў на еўрапейскай прасторы ў пасляваенны перыяд, асабліва ў апошняй чвэрці стагоддзя. Пры гэтым рэдакцыя штоквартальніка заставалася пад дахам мюнхенскай установы. З асабістага досведу Юргена вынікала, што кожны з наведвальнікаў Інстытута мог патрапіць у навуковую бібліятэку, дзе даследчыкаў чакалі не толькі агульнавядомыя выданні, якія ўпрыгожвалі яе паліцы, але і арыгінальныя, нават малавядомыя кнігі, напрыклад, Hitlers

[1] *Zarusky J.* Die deutsche Sozialdemokraten und das sowjetische Model. Ideologische Auseinandersetzung und außenpolitischen Konzeptionen 1917–1933. Inauguraldissertation zur Erlangung des Akademischen Grades eines Dr. phil. – München, 1990. – 450 S.

zweites Buch. Да таго ж, не выходзячы за межы Інстытута, наведвальнік меў цудоўную магчымасць папрацаваць з унікальнымі дакументальнымі крыніцамі, у тым ліку з калекцыі «Александрыйскіх мікрафільмаў», фондаў розных устаноў Трэцяга рэйха, Галоўнага ўпаўнаважанага па чатырохгадовым плане і інш. Якраз у фондах гэтага архіва мне не без сяброўскай дапамогі Юргена ўдалося ўпершыню ў германскім крыніцазнаўстве знайсці малавядомыя дзённікі берлінскіх яўрэяў М. Крон і Б. Руднэра, дэпартаваных у сярэдзіне лістапада 1941 г. у Мінск. Гісторыю паходжання гэтых дакументаў у фондах архіва Інстытута нам выявіць не ўдалося, нягледзячы на тое, што сярод зацікаўленых асоб былі і супрацоўнікі навуковай установы.

Сярод іх Юрген адразу вылучыў двух маладых даследчыкаў – Петэра Ліба і Дзітэра Поля. Першы з іх актыўна распрацоўваў гісторыю 707-й пяхотнай дывізіі Германскага вермахта, якая ўдзельнічала ў масавых забойствах яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Генеральнай акругі «Беларусь» увосень 1941 г.[1] Другі навуковы супрацоўнік даследаваў наступствы Халакосту, раскрываючы маштабы трагедыі на прыкладзе акупаваных усходніх тэрыторый, у тым ліку Беларусі, а таксама паказваючы гэту гістарычную з'яву не толькі ў вымярэнні розных тэрытарыяльных ландшафтаў, але і ў праламленні розных гістарыяграфічных наратываў[2].

Дзякуючы клопатам Юргена мне да ўсяго ўдалося зрабіць тое, пра што было цяжка марыць у Мінску, – атрымаць у якасці экскурсавода аднаго з самых лепшых знаўцаў нацысцкай гісторыі Мюнхена – прафесара ўніверсітэта Клаўса Ланкхайта. Праведзеная ім на высокім прафесійным узроўні экскурсія па вуліцах горада загучала для мяне не толькі ў святле важных падзей пачатку 1920-х гадоў, але і ў шматлікіх імёнах і адрасах, фактах і гістарычных месцах сталіцы Баварыі.

Сярод важных прыкмет характару Юргена мне адразу кінуўся на вочы яго аптымізм, адкрытасць і жыццярадаснасць, якія пастаянна праяўляліся за часам нашых асабістых размоў, нават пры абмеркаванні сур'ёзных пытанняў мінулага. Напрыклад, пасля майго гадзіннага даклада, які прыйшлося трымаць перад навукоўцамі Інстытута, хто прафесійна займаўся пытаннямі ваеннай гісторыі, цяперашні стан беларускай гістарычнай навукі выклікаў не толькі значны навуковы інтарэс, але і паставіў у парадак дня прынцыпова важную задачу аб неабходнасці выкарыстання новых падыходаў у даследаванні гісторыі Другой сусветнай вайны. Крытычныя ацэнкі асобных тэм, сярод якіх лёсы савецкіх ваеннапалонных, выкарыстанне мясцовага насельніцтва ў якасці працоўнай сілы, маштабы знішчэння яўрэйскага і мясцовага

---

[1] *Либ, П.* Преступники по убеждению? (Полковник Карл фон Андриан и уничтожение евреев 707-й пехотной дивизией в 1941–1942 гг.) / П. Либ // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск, 16 мая 2003 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск : МДЛУ, 2003. – С. 115–121.

[2] *Поль, Д.* Сучаснае даследаванне Халакосту: вынікі і перспектывы / Д. Поль // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. канф., Мінск, 16 мая 2003 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск : МДЛУ, 2003. – С. 154–163.

насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. і інш., якія больш чым праз паўстагоддзя пасля завяршэння вайны не знайшлі свайго ўсебаковага адлюстравання ні ў савецкай, ні ў постсавецкай беларускай навуцы, выклікалі ў Юргена жаданне прыйсці мне на дапамогу. Пытанні, пастаўленыя ўдзельнікамі сустрэчы, патрапілі ў фокус нашых бясконцых сустрэч і пастаянных абмеркаванняў за кубачкам кавы. Менавіта ў той час прагучала яшчэ адна вельмі важная прапанова з боку нямецкага калегі, на той час члена рэдакцыйнай калегіі штоквартальніка, аб бясплатнай падпісцы на гэта вядучае навуковае выданне Германіі. Пра публікацыі навуковых артыкулаў, унікальных дакументаў і дыскусійных матэрыялаў на старонках гэтага выдання таксама сведчыў артыкул аднаго з членаў рэдакцыйнай рады – Юргена Царускі, прысвечаны паўвекавому юбілею штоквартальніка і аналізу ўсяго таго, шта было апублікавана на яго старонках[1]. З артыкула вынікала, што на той момант часопіс стаў міжнародным флагманам, у якім друкаваліся замежныя даследчыкі з Венгрыі, Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраіля, Іспаніі, Партугаліі і Фінляндыі, дэманструючы на яго старонках здабыткі вядучых навуковых школ і вызначаючы перадавыя тэндэнцыі па даследаванні найноўшай гісторыі.

Працяг нашых сустрэч меў месца праз два з паловай гады ў Расіі, дзе ў заходне-сібірскім г. Кемерава ў канцы верасня 2005 г. ладзілася канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю завяршэння Другой сусветнай вайны. Выбар месца правядзення такой сустрэчы на азіяцкім кантыненце не быў выпадковым, паколькі тут у пачатку верасня 1945 г. былі падпісаны дакументы аб капітуляцыі мілітарысцкай Японіі і завяршэнні вайны. Нягледзячы на тое, што галоўная ідэя сустрэчы навукоўцаў з розных краін, у тым ліку з Беларусі, Германіі і Расіі, палягала ў праблематыцы завяршальнага этапу вайны, галоўным прадметам нашых з Юргенам размоў заставаўся германскі нацыянал-сацыялізм і яго даследаванне нямецкімі, расійскімі і беларускімі гісторыкамі. Юрген з вялікім інтарэсам успрыняў навіну аб выхадзе ў МДЛУ маёй уласнай манаграфіі «Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны» (Мінск, 2004). З боку нямецкага калегі пастаянна гучала тэза пра тое, што даследчыкі розных напрамкаў перайшлі на новую ступень распрацоўкі нацысцкага мінулага, каб адкрыта паказваць маштабы злачынстваў і трагедыі мірнага насельніцтва на акупаванай савецкай тэрыторыі. Асаблівую ўвагу Ю Царускі надаваў публічнаму абмеркаванню праблемных пытанняў вайны, у першую чаргу гісторыі нацысцкіх злачынстваў, Халакосту і неабходнасці больш глыбокага вывучэння нацызму дзеля таго, каб атрымаць адэкватны адказ на пытанне аб яго масавай падтрымцы ў нямецкім грамадстве. У гэтым плане Юрген прыводзіў прыклады з агульнагерманскай спрэчкі гісторыкаў, якая адбылася ў ФРГ у 1986–1987 гг. і выклікала хвалю публікацый аб маштабах нацысцкіх

---

[1] *Zarusky J.* Die Schriftenreihe der Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte / J. Zarusky // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – 2003. – Heft 1. – S. 89–106.

злачынстваў, перш за ўсё – супраць яўрэйскага народа. Як адзначаў нямецкі навуковец, дух таго часу яму быў тады добра вядомы дзякуючы шматлікім газетным і часопісным публікацыям, у тым ліку на старонках інстытуцкага штоквартальніка, які ён чакаў з адметным хваляваннем, паколькі заўсёды знаходзіў новыя падыходы для даследавання гэтай складанай, як высвятлялася, маладаследаванай тэматыкі. Менавіта там, у Заходняй Сібіры, мне ўпершыню ўдалося пачуць меркаванне нямецкага гісторыка аб «еўрапейскім бальшавізме», які, на яго погляд, адыграў жахлівую ролю ў гісторыі Еўропы. Думка, якая прагучала вельмі нечакана, аднак на той час пераканаўча навукова не была абгрунтавана. Наша размова ў рэчышчы гэтага пытання пакінула шмат вострых момантаў, але заставалася ў парадку дня нашых новых сустрэч.

Адну з іх падараваў мне Юрген у Фрайбургу ўвосень 2006 г., калі ладзілася мая чарговая навуковая стажыроўка ў Федэральным ваенным архіве. Яго прыезд азначаў для мяне вельмі шмат. Перш за ўсё, Юрген на шляху ў Бон павінен быў істотна парушыць свой маршрут, распачаты ў Мюнхене. Па-другое, запланаваць значнае адхіленне ад яго на некалькі гадзін з улікам уласнага бюджэту асабістага часу і ранішнім тэрмінам пачатку мерапрыемстваў у Боне. Па-трэцяе, апынуцца ў Фрайбургу толькі на адзін вечар і адну ноч дзеля таго, каб пабачыцца і абмяняцца думкамі па актуальных навуковых пытаннях. У выніку ўсяго гэтага Юрген вечарам апынуўся ў Фрайбургу, дзе замовіў для доўгачаканай размовы месца ў італьянскім рэстаране. Мы не толькі сустрэліся, даведаліся штосьці новае, але і здолелі падзяліцца сваімі думкамі, абмеркаваць існуючыя пытанні і нават вызначыць некаторыя перспектывы. Разам з тым з’явіліся новыя планы, прапановы, дамоўленасці. Адна з іх не спраўдзілася, паколькі мне не ўдалося прыняць удзел у круглым стале, праведзеным восенню 2008 г. з мэтай абмеркавання такіх важных пытанняў, як акупацыя, калабарацыя і Халакост.

Шкада, але роўна праз год падобная сітуацыя паўтарылася. Толькі датычылася гэта цяпер Юргена, які не змог прыехаць на сустрэчу ў Берлін, дзе адбывалася прэзентацыя новага даследчага праекта Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене «Вермахт у нацысцкай дыктатуры». Між тым выканаўцы праекта – П. Ліб, Д. Поль, А. Топе, Х. Хартман, Й. Хюртэр і дырэктар Інстытута Х. Мёлер – з вялікай радасцю распавядалі мне пра іх калегу з вялікай літары, адзначалі яго захапленні, пастаяннае імкненне да набыцця новых ведаў, вялікую працаздольнасць, адказнасць за ўзятую справу, добрасумленнасць. Пры гэтым расказалі пра ўдзел Юргена ва ўнікальным грамадскім праекце, якому ён аддаваў вельмі шмат асабістага часу, сіл і здароўя дзеля таго, каб захаваць памяць аб ахвярах нацысцкага канцэнтрацыйнага лагера ў Дахау.

Пра навуковую працу, якая б давала магчымасць зразумець сутнасць згаданай вышэй думкі, Юрген напісаў мне ў канцы 2011 г. Папярэдзіў, каб я ўважліва чытаў студзеньскі нумар штоквартальніка Інстытута. Такую

радасць ён падараваў нямецкаму чытачу ў сваім артыкуле, выкананым хутчэй у жанры навуковай рэцэнзіі працы «Крывавыя землі. Еўропа паміж Гітлерам і Сталіным» (Нью-Йорк, 2010) амерыканскага даследчыка Цімаці Снайдэра. На думку Юргена, задача па асэнсаванні маштабных наступстваў, пакінутых у выніку панавання дзвюх таталітарных дыктатур у першай палове і сярэдзіне XX стагоддзя, так і засталася недасягнутай[1]. У якасці доказных пацверджанняў нямецкі гісторык прыводзіць навуковыя тэзы, прынятыя ў еўрапейскай гістарыяграфіі, пабудаванай на розных крыніцах, у тым ліку арыгінальных дакументах Трэцяга рэйха. Юрген Царускі звяртаецца да некаторых прыкладаў, якія мелі месца ў час нацысцкай акупацыі Беларусі. Так, тэзіс Снайдэра аб тым, што «большасць яўрэяў у мінскім гета не спяшаліся збегчы ў лес», знаходзіць вельмі крытычную ацэнку ў нямецкага гісторыка, які сцвярджае, што згаданы «тэзіс Снайдэра супярэчыць законам гістарычнай рэчаіснасці»[2]. Апроч падзей мінскага гета Царускі выкарыстоўвае і іншыя важныя факты трагічнай гісторыі ў Беларусі. Напрыклад, факт знішчэння ў верасні 1942 г. 310-м паліцэйскім батальёнам вёскі Боркі разам з больш за 700 чалавек мірнага насельніцтва, на якое пала падазрэнне ў сувязях з партызанамі. Пры гэтым нямецкі гісторык канстатуе, што мірнае насельніцтва Беларусі за часам нацысцкай акупацыі пацярпела больш чым дзе, за выключэннем блакаднага Ленінграда. У выніку з дзесяцімільённага насельніцтва кала 1,6–1,7 мільёна чалавек загінулі, пры гэтым большасць ахвяр складалі не яўрэі, хоць з яўрэйскага насельніцтва выжылі толькі каля пяці адсоткаў. Юрген Царускі прыводзіць у якасці аргумента тэзіс, выказаны ваенным карэспандэнтам Васілём Гросманам: Шоа быў чымсьці значна больш маштабным, чым проста тэрорам акупантаў, а менавіта праграмай абсалютнага знішчэння[3]. Такія вынікі сведчаць пра тое, што нямецкі аўтар крытычнага аналізу адказна ставіцца да тэмы даследавання, прафесійна працуе з дакументальнымі фактамі, ставячы перад сабой разам з тым высокія маральныя патрабаванні.

Тэма мінскага гета і лагера смерці Трасцянец сталі ў парадак дня і нашай апошняй дамоўленасці пра сустрэчу ў Мінску вясной бягучага года ў рамках штогадовай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць». Юрген з вялікай радасцю прыняў запрашэнне на ўдзел у ёй, упершыню прапануючы для беларускай навуковай грамадскасці даклад на тэму «Германская акупацыя Беларусі (1941–1944) на старонках штоквартальніка „Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte" Інстытута найноўшай гісторыі»,

---

[1] *Zaruski, J.* Timothy Snyder. „Bloodlands". Kritische Anmerkungen zur Konstruktion einer Geschichtslandschaft / J. Zaruski // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – 2012. – Nr. 1. – S. 31.

[2] Там жа. – S. 26.

[3] *Гроссман, В.* Украина без евреев / В. Гроссман // Besatzung, Kollaboration, Holocaust. Neue Studien zur Verfolgung und Ermordung der europäischen Juden. – München: Institut für Zeitgeschichte, 2008. – S. 189–200 .

з якім ён павінен быў адкрываць першае пленарнае пасяджэнне. Вырашэнне другой важнай задачы гэтага прыезду прадугледжвала наведванне Мемарыяльнага комплексу «Трасцянец», правядзенне мной асабіста доўгачаканай экскурсіі для ўдзельнікаў канферэнцыі. Аднак здарылася так, што планы не спраўдзіліся. Як нам паведамілі за дзень да пачатку канферэнцыі, не стала вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене доктара Юргена Царускі.

Памяць жа пра яго назаўсёды застанецца з намі. Па нашым перакананні, германская гістарычная навука, а разам з ёй калегі і сябры згубілі таленавітага даследчыка, апантанага навукоўцу і цудоўнага чалавека. Аднак навуковая грамадскасць розных краін, у тым ліку Беларусі, будзе і надалей звяртацца да багатай даследчыцкай спадчыны Юргена Царускі.

*Сяргей Яўгенавіч Новікаў,*
*кандыдат гістарычных навук*